Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 18 (527) | Субота, 25 мая 1963 г. | Цана 1 кап. | Год выдання XVI-ы

*Партыйнае жыццё*

## Работа партбюро прызнана станоўчай

У партыйных арганізацыях факультэтаў у гэтыя дні праходзяць справаздачна-выбарчыя сходы. Камуністы абмяркоўваюць справаздачы партыйных бюро, глыбока ўскрываюць недахопы ў вучэбна-выхаваўчай і культурна-масавай рабоце. Адбыўся такі сход і на гістарычным факультэце. Сакратар партыйнага бюро Т. І. Прытыцкая ў справаздачы адзначыла, што за год работы партыйная арганізацыя факультэта, кіруючыся гістарычнымі рашэннямі XXII з'езда КПСС і Праграмай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, дасягнула значных поспехаў. У рады партыі прыняты шаснаццаць чалавек, сярод якіх пераважна аспіранты і студэнты. Усе камуністы маюць партыйныя даручэнні. Прафесар І. Н. Лушчыцкі і дацэнт В. В. Цакуноў узорна кіруюць работай навуковых гурткоў.

На партыйным бюро і партыйных сходах сістэматычна абмяркоўваліся пытанні шматбаковага жыцця партыйнай арганізацыі. Работа добраахвотнай народнай дружыны, рэдкалегій насценных газет, падрыхтоўка навуковых кадраў — усё гэта глыбока цікавіла партыйную арганізацыю гістарычнага факультэта.

Шмат увагі ўдзяляла партыйная арганізацыя і партыйнае бюро палітыка-выхаваўчай рабоце, якая была накіравана на тое, каб цяперашнія студэнты — будучыя выкладчыкі гісторыі — былі глыбока перакананымі змагарамі за перамогу камунізма. З гэтай мэтай арганізоўваліся разнастайныя дыспуты, калектыўныя паходы ў кіно і тэатры, паездкі па гістарычных месцах краіны, экскурсіі. Нядрэнна працаваў і агіткалектыў.

Многа ўвагі ўдзяліла дакладчыца крытыцы недахопаў. Яна гаварыла аб нездавальняючай рабоце мастацкай самадзейнасці, аб фактах парушэння працоўнай і партыйнай дысцыпліны асобнымі членамі арганізацыі.

У цэнтры ўвагі ў дакладзе былі пытанні клопатаў партыйнай арганізацыі аб паляпшэнні вучобы і быту студэнтаў. Таму і не дзіўна, што пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі, у якіх актыўны ўдзел прынялі камуністы-студэнты.

Прамоўцы галоўную ўвагу ў сваіх выступленнях надавалі крытыцы недахопаў. У гэтым адчуваліся клопаты радавых камуністаў аб паляпшэнні ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу на факультэце.

Студэнт Жаркоў сваё выступленне прысвяціў аналізу работы навуковых студэнцкіх гурткоў. Ён вельмі станоўча адгукнуўся аб кіраўніку гуртка гісторыі КПСС Хрыпко Н. П., якая сур'ёзна адносіцца да даручанай справы. Разам з тым Жаркоў адзначыў, што асобныя навуковыя гурткі існуюць толькі на паперы, што, зразумела, было вядома партыйнаму бюро. На думку прамоўцы, у работу навуковых гурткоў нельга прыцягваць першакурснікаў, якія яшчэ не падрыхтаваны да навуковай работы.

Стан нагляднай агітацыі на факультэце крытыкаваў студэнт Гілеп. Напрыклад, на факультэце нямала выдатнікаў вучобы. А дзе стэнд з іх партрэтамі? Няма!

Студэнты Малішэўскі і Лейкін выказалі рад дзелавых меркаванняў адносна паляпшэння выхаваўчай работы сярод студэнтаў і паляпшэння іх быту.

Апрача студэнтаў, у спрэчках выступілі дэкан факультэта П. З. Савачкін, дацэнты Фрыдман і Нячай.

Сход прайшоў на высокім арганізацыйна-палітычным узроўні. Работа партыйнага бюро прызнана станоўчай. Выбрана новае бюро партыйнай арганізацыі факультэта, у састаў якога ўвайшлі 9 чалавек. На першым арганізацыйным пасяджэнні бюро факультэта сакратаром партыйнага бюро зноў выбрана Т. І. Прытыцкая, намеснікам сакратара — В. А. Мельцар.

Ул. БАРАНАЎ.

# З узнагародай, ФІДЭЛЬ!

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

## Аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза таварышу Фідэлю КАСТРА РУС

Прызнаючы выдатныя заслугі таварыша Фідэля Кастра Рус у арганізацыі пераможнай барацьбы за свабоду і незалежнасць гераічнага кубінскага народа, які ўнёс свой дастойны ўклад у вялікую справу міру і сацыялізма, і адзначаючы яго вялікую ролю ва ўмацаванні і развіцці брацкай савецка-кубінскай дружбы, прысвоіць першаму сакратару Нацыянальнага кіраўніцтва Адзінай партыі сацыялістычнай рэвалюцыі і прэм'ер-міністру Рэвалюцыйнага ўрада Рэспублікі Куба таварышу **Фідэлю Кастра Рус** званне **Героя Савецкага Саюза** з уручэннем яму ордэна **Леніна** і медаля **«Залатая Зорка»**.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. БРЭЖНЕЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. ГЕАРГАДЗЕ.**

Масква, Крэмль
23 мая 1963 г.

## Універсітэт за тыдзень

* * *

*Адбылося першае пасяджэнне новага саставу Савета СНТ універсітэта, на якім быў прыняты план работы Савета на месяц.*

* * *

*На адбыўшымся днямі пленуме шашачнай федэрацыі БССР намеснікам старшыні федэрацыі быў выбран старшыня шашачнага клуба БДУ Генадзь Драбушэвіч.*

* * *

*Адбылася перадапошняя лекцыя з цыкла «Майстры замежнага мастацтва». Слухачы пазнаёміліся з творчасцю Матэйкі і яго сучаснікаў.*

## Па закліку сэрца

Журналіст — гэта перш за ўсё рамантык, летуценнік, чалавек, у якога душа вандроўніка. Яго клічуць шляхі-дарогі, блакітныя далі, жыццёвыя сцежкі. Ісці, ісці, усё зведаць, усё ўбачыць, адчуць усім сэрцам пульс жыцця. Толькі не стаяць на месцы. Сэрца кліча наперад, туды, дзе ў вячэрнім змроку пераклікаюцца гудкі, ахопліваючы душу хваляваннем, неспакоем.

І тады Васіль Макарэвіч успамінае. Перад вачыма праплывае далёкая Сібір, лясныя дарогі, находжаныя сцежкі, арцельныя рабочыя-лесарубы, плытагоны, будаўнікі, з якімі ён працаваў да паступлення ва універсітэт. Прайшло чатыры гады, але Васілю здаецца, што ён толькі ўчора зышоў з поезда. Зышоў на прыпынку, пабыў крыху, і зноў цягне дарога.

Васіль Макарэвіч разам са сваімі сябрамі па пяру Анатолем Сербантовічам, Іванам Дашчынскім, Вечаславам Дашкевічам, Германам Кругловым едзе праз некалькі тыдняў на цаліну, у сонечны Казахстан. Студэнты-журналісты будуць трапным словам, добрай парадай, вострай крытыкай дапамагаць цаліннікам. Едуць туды хлопцы ўпершыню. Уражанняў будзе шмат. І таму нашы універсітэцкія паэты Макарэвіч і Сербантовіч разам з дарожнымі рэчамі рыхтуюць сваю паэтычную зброю. Будуць у іх вершы, будуць паэмы, у якіх будзе чыстае блакіт неба, і шырокія казахстанскія стэпы, і людзі, прыгожыя, добрыя, сціплыя працаўнікі, чыёй працай памнажаецца багацце краіны.

Ул. МАНГІНОВІЧ

РЫГОР БАРАДУЛІН

### ЦАЛІННАЯ ПШАНІЦА

З машын спадае хваляю тугой  
Цалінная пшаніца.  
Далонь падстаў — спячэ гарачынёй:  
Тут сонца не скупіцца.  
Прыглядзься: не пшаніца, а бурштын  
Бяжыць, адшліфаваны.  
Хоць наніжы яго ў каралі ты—  
І падары каханай.  
Да пульсу стэпу ўслухайся — здалёк  
Маторaў гул нясецца.  
Тут каравай і ў казку новы калабок  
Ужо чуваць — пячэцца...

МАРА. Малюнак М. Знака.

КУТОК ЦАЛІННІКА



## Стихи Александра Омельченко

### БЕРЁЗКА

А березка, как девчонка
гибкая,
Наклонилась к зеркалу воды.
Тянутся к ней с первою
улыбкою
Первые весенние цветы.

И она весь мир понять
старается,
Мир загадок, сложных и
простых:
Отчего ей солнце улыбается,
Почему к ней тянутся цветы?

# ГУМАРЭСКІ

## *Дзіўны выпадак*

У хаце-чытальні адбывалася нешта незвычайнае. Прысутныя былі ўсхваляваны да крайнасці: сустракаліся два моцных шахматысты — Бяляўкін і Чарняўкін. Сапраўды, гульня была вострай. Хутка на дошцы засталіся толькі адны каралі, але барацьба не спынялася. Страсці «балельшчыкаў» разгараліся з кожным ходам: хто пераможа?

— Нічыя, — заўважыў я.

—Як нічыя?! —здзівіўся Бяляўкін. — Вы чулі пра цікавую гісторыю з каралём Францыі Людовікам? Не? Тады слухайце... У адным з баёў Людовік трапіў у палон. «Кароль, вы ў палоне», — лікаваў рыцар. «Караля ў шахматах у палон не бяруць», — спакойна адказаў Людовік. Рыцар разгубіўся. А кароль тут жа адсек яму шабляй галаву... Не-е-е. Я ўжо лепш забяру караля «праціўніка». — закончыў Бяляўкін.

Цяпер на дошцы красаваўся пераможца — кароль белых. Гэта быў, пэўна, адзіны такі выпадак у гісторыі шахмат.

## *Самамненне*

Перад пачаткам гульні мой «праціўнік» аб'явіў, што ад маёй пазіцыі праз дваццаць хвілін не застанецца ні пуха ні пяра.

— Ну, белыя пачынаюць...— з ганарлівай усмешкай на твары прамовіў ён.

— І выйграюць, —са здзеклівай інтанацыяй у голасе дадаў я.

Партыя працякала напружана. У сярэдзіне ігры я прапанаваў ахвяру фігуры:

— Можа, возьмеце?

— А чаму б і не? Даронаму каню ў зубы не заглядаюць.

— Але глядзі ўдвая, каля каня ахвяроўваюць.

— Хм... нічога страшнага не бачу, — і забраў каня. Схіліўшыся над столікам, ён нешта мармытаў сабе пад нос. «Што ход наступны мне рыхтуе?» — пачуў я.

— Мат у два хады.

Анатоль КАЛІЦІЕЎСКІ.

## Новы састаў Савета СНТ універсітэта

Адбыўся справаздачна-выбарчы сход студэнцкага навуковага таварыства Белдзяржуніверсітэта. На ім быў абмеркаваны даклад старшыні Савета СНТ Э. Радоўскага.

Сход выбраў новы састаў Савета СНТ універсітэта.

**В. Калечыц** (геафак)—старшыня,

**М. Грыгаровіч** (хімфак) — намеснік старшыні,

**Г. Пальцаў** (філфак) — намеснік старшыні па гуманітарных факультэтах.

**Сняткоў** (біяфак)—намеснік старшыні па прыродазнаўчых факультэтах,

**Н. Шумейка** (фізфак) — намеснік старшыні па фізічнаму і матэматычнаму факультэтах,

**Я. Бараноўскі** (гістфак) —адказны за арганізацыйную работу,

**Г. Гарэлік** (фізфак) — адказны за работу лектарскай групы,

**В. Слабажанін** (юрфак) — адказны за работу сектара ўліку і кантролю,

**М. Канцлер** (філфак) — адказны за работу сектара друку,

**Я. Шатаў** (біяфак) — адказны за работу сектара сувязі з вытворчасцю,

**В. Шыраеў** (матфак) — адказны за работу сектара сувязі з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі краіны.

## Новые книги по естественным наукам, поступившие в библиотеку БГУ

Кедров Б. М. **Предмет и взаимность естественных наук.** М., Издательство АН СССР, 411 с.

Перковский Б. Б. **Охрана природы — всенародное дело.** (Сборник законов, положений и постановлений по охране природы в Белорусской ССР). Минск, Сельхозгиз БССР, 1962. 140 с.

Гахов Ф. Д. **Краевые задачи.** Изд. 2-е, переработанное и дополненное. М., Физматгиз, 1963. 639 с.

Гельфанд А. О. и Линник Ю. В. **Элементарные методы в аналитической теории чисел.** М., Физматгиз, 1962. 272 с.

Фаермарк Д. С. **Развитие интереса к математике.** М., Учпедгиз, 1962. 88 с.

Холл М. **Комбинаторный анализ.** Перевод с английского. М., Издательство иностранной литературы, 1963. 97 с.

Малиев Ю. Н. **Математические машины и программирование.** (Учебное пособие). Куйбышев, 1962. 217 с.

**Программирование для электронной вычислительной машины «Урал-1».** М., Машгиз, 1962. 236 с.

Келлог У. и Саган К. **Атмосферы Марса и Венеры.** Перевод с английского. М., Издательство иностранной литературы, 1962. 276 с.

Киттель Ч. **Введение в физику твёрдого тела.** Перевод с английского. Издание 2-е, переработанное. М., Физматгиз, 1962. 636 с.

Пасечник М. В. **Вопросы нейтронной физики средних энергий.** Киев, Издательство АН УССР, 1962. 336 с.

Русанов В. Д. **Современные методы исследования плазмы.** М., Госатомиздат, 1962. 183 с.

Смит Я. и Вейн Х. **Ферриты.** Физические свойства и практические применения. Перевод с английского. М., Издательство иностранной литературы, 1962. 504 с.

Левинсон И. Б. и Никитин А. А. **Руководство по теоретическому вычислению интенсивностей линий в атомных спектрах.** Л., Издательство ЛГУ, 1962. 359 с.

**Ядерные реакции.** Под ред. П. М. Эндта и М. Демера. Перевод с английского. Т. I. М., Госатомиздат, 1962. 479 с.

**Методы спектрального анализа.** (Учебник для университетов). Под ред. проф. В. Л. Левшина. М., Издательство МГУ, 1962. 509 с.

**Вопросы ядерной метеорологии.** Сборник статей. Под ред. канд. физ.-мат. наук И. Л. Кароля и С. Г. Малахова. М., Госатомиздат, 1962. 272 с.

Синицын В. М. **Палеография Азии.** М.- Л., Издательство АН СССР, 1962. 268 с.

Хвостиков И. А. **Физика озоносферы и ионосферы.** М., Издательство АН СССР, 1963. 663 с.

Дэвис В. М. **Геоморфологические очерки.** Перевод с английского. М., Издательство иностранной литературы, 1962. 455 с.

Микулич И. Н. **Занимательная география.** Махачкала, Дагучпедгиз, 1962. 256 с.

Урбах В. Ю. **Математическая статистика для биологов и медиков.** М., Издательство АН СССР, 1963. 323 с.

# фізкультура і спорт

## Поспех у Кохтла-Ярве

Абараняць гонар горада Мінска на першынстве рэспублік Прыбалтыкі і гарадоў Ленінграда, Мінска і Ташкента па шашках была прадастаўлена чэмпіёнам горада, камандзе Белдзяржуніверсітэта, за якую выступалі кандыдаты ў майстры Г. Драбушэвіч, Я. Кухарчук, Ю. Струк, першаразраднікі П. Несцяровіч, А. Абрамовіч і А. Хапалюк. Першынство праводзілася ў эстонскім горадзе Кохтла-Ярве з 13 па 19 мая. У першынстве ўдзельнічалі восем каманд, у асноўным укамплектаваных майстрамі спорту і кандыдатамі ў майстры.

Перад нашай камандай стаяла цяжкая задача. Але напорыстасць, дружба, імкненне да мэты перамаглі. Каманда універсітэта заняла трэцяе месца, прапусціўшы наперад толькі майстроў Ташкента і Ленінграда. Усе ў камандзе выканалі норму кандыдацкага бала. А. П. Несцяровіч і А. Абрамовіч, набраўшы тры бала, завяршылі сям'ю універсітэцкіх кандыдатаў у майстры да шашчаў чалавек.

Асабліва паспяхова выступіла Анна Хапалюк. Перад апошнім турам яна адставала ад лідэра на паўачка. Але ў апошняй партыі перамагла лідэра і заняла першае месца, заваяваўшы спецыяльны прыз, дыплом і пераходны кубак. Гэта вялікі поспех юнай шашысткі.

## Пачатак не зусім удалы

Пакінуўшы Мінск, які яшчэ вытрымліваў атакі вясны, застаючыся шэрым і ад таго крыху сумным, мы былі ўражаны растварыўшымся ў зеляніне Тбілісі. Усе дзесяць дзён, якія баскетбалісты і баскетбалісткі СДСТ «Буравеснік» правялі ў гэтым горадзе, праляцелі дзесяццю хвілінамі.

Ішло першынство ЦС СДСТ «Буравеснік» — вельмі адказныя спаборніцтвы. Жаночая зборная горада была ў асноўным укамплектавана спартсменкамі БДУ.

Урачыстым парадам удзельнікаў адкрываецца першынство. Спартсменаў Масквы, Ленінграда, саюзных рэспублік віталі шматлікія гледачы. Усе святкавалі, а нам не пашанцавала. У гэты дзень мы прайгралі варонежкам. Назаўтра зноў няўдача — ва ўпартай барацьбе ўступілі перамогу больш вопытным баскетбалісткам Грузінскага політэхнічнага інстытута. Пасля чатырох дзён спаборніцтваў выявілася, што першыя дзве няўдачы прывялі нашу каманду ў фінальную падгрупу, якая асрэчвала 7—12 месцы з 17.

Мы занялі 8 месца, а юнакі нават апошняе, 17-е. З дрэнным настроем вярталіся дамоў. Пад крылом самалёта паказаўся Мінск, і мы яго не пазналі. Мы зноў апынуліся ў зялёным, прыгожым горадзе—у родным Мінску. І канешне ж, кожны сказаў сабе: «Я зраблю ўсё, каб у наступны раз парадаваць цябе перамогай!».

Я. СМАЛЕНСКАЯ.

## Анна Хапалюк— другі прызёр першынства рэспублікі

Закончылася першынство Беларусі па шашках сярод жанчын. 13 мацнейшых шашыстак змагаліся за званне чэмпіёнкі, сярод іх — 6 выхаванак універсітэта.

Першае месца другі год запар заваявала выпускніца матфака, цяпер інжынер вылічальнага цэнтра Дзяржплана БССР Лілія Лесіна. 2—3 месца падзялілі Анна Хапалюк (фізфак), Валянціна Крыскевіч (хімфак) і Людміла Шчыгельская (радыёзавод). Па табліцы каэфіцыентаў другое месца у Анны Хапалюк.

Г. ДРАБУШЭВІЧ.

## „Советское государство и право" № 5

Выйшаў з друку часопіс **«Советское государство и право»** № 5. Ён адкрываецца артыкулам доктара юрыд. навук прафесара А. І. Дзянісава, у якім аналізуюцца некаторыя моманты з дзейнасці У. І. Леніна, як выдатнага тэарэтыка і арганізатара Савецкай дзяржавы. У нумары працягваецца абмеркаванне тэарэтычных праблем агульнанароднай дзяржавы і права. Пад гэтай рубрыкай часопіс апублікаваў артыкулы кандыдатаў юрыдычных навук Ю. А. Ціхамірава, І. П. Рамана, дактароў юрыдычных навук О. С. Іофе і М. Д. Шаргародскага.

Змешчаны таксама артыкул Е. В. Шорынай аб ленінскіх прынцыпах партыйна-дзяржаўнага кантролю, які з'яўляецца, па сутнасці, першай навуковай юрыдычнай публікацыяй па гэтаму важнаму цяпер пытанню пасля рэарганізацыі савецкіх кантрольных органаў.

Артыкул польскіх вучоных-правазнаўцаў прафесараў С. Завадскага і С. Эрліха прысвечаны актуальным праблемам навукі дзяржавы і права Польскай Народнай Рэспублікі. У артыкуле праф. А. Д. Кейліна ўпершыню ў юрыдычным друку распрацоўваюцца прававыя аспекты так званай «заходне-еўрапейскай інтэграцыі», маючыя важнае палітычнае значэнне. У артыкуле Л. С. Явіча працягваецца абмеркаванне пытанняў марксісцка-ленінскай метадалогіі юрыдычнай навукі. У нумары змешчаны таксама матэрыялы на актуальныя тэмы па пытаннях грамадзянскага і крымінальнага права (артыкулы Г. С. Шапкінай, І. А. Танчука, А. І. Шабанавай, Гольста і Марыупальскага), агляды практыкі, крытыка-бібліяграфічны матэрыял.

Рэдакцыя часопіса **«Советское государство и право».**

За рэдактара Я. ЛЯХАЎ.

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03869. Тыр. 2000. Зак. 1920.